# *§ 20–0. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый у Познім сярэднявеччы

**1. Прыклады формаў праўлення — манархій і рэспублік ва ўсходне- і заходнееўрапейскім рэгіёнах.** Канец XV ст. — гэта час цэнтралізацыі шэрагу еўрапейскіх дзяржаў, якія змаглі пераадолець раздробленасць, — перш за ўсё Францыі і Англіі. У Францыі завяршылася Стогадовая вайна (1337–1453 гг.), што прывяло да ўмацавання французскага каралеўства пад валадарствам дынастыі Валуа і да страты Англіяй кантынентальных уладанняў. Францыя, перажыўшы бедствы вайны, паступова фарміравала моцную манархію, якая будзе адыгрываць вядучую ролю ў еўрапейскай палітыцы. Англію, наадварот, ахапілі ўнутраныя хваляванні, такія як Вайна Пунсовай і Белай ружы (1455–1487 гг.), якая аслабіла ўладу манархіі. Тым не менш гэтая барацьба завяршылася ўмацаваннем дынастыі Цюдораў, якая пазней распачне працэс абнаўлення дзяржавы.

На Скандынаўскім паўвостраве ў 1397 г. была заключана Кальмарская унія, што аб'яднала Данію, Нарвегію і Швецыю пад уладай адной кароны. Аднак унутраная барацьба за ўладу і супярэчнасці паміж краінамі-ўдзельніцамі аслаблялі гэты саюз, што ў выніку прывяло да яго распаду.

Спробы цэнтралізаваць кіраванне ў Свяшчэннай Рымскай Імперыі не далі істотных вынікаў. На тэрыторыі Германіі працягвалі існаваць сотні дзяржаўных утварэнняў рознага ўзроўню. Нягледзячы на фармальнае падпарадкаванне мясцовых валадароў імператару, рэальная ўлада знаходзілася ў руках князёў, біскупаў і так званых «вольных гарадоў». Гэтая фрагментацыя аслабляла імперыю,

што рабіла яе прыступнай для знешніх пагроз і ўнутраных канфліктаў. Раздробленай заставалася і Італія, слабасцю якой намагаліся скарыстацца суседзі. У 1494 г. пачалася эпоха Італьянскіх войнаў.

У Цэнтральнай Еўропе напрыканцы Сярэднявечча панавала дынастыя Ягелонаў, прадстаўнікі якой апынуліся на прастоле не толькі ў Польшчы, але і ў Венгрыі, і ў Чэхіі, а таксама Харватыі. Каралеўства Польшча знаходзілася ў асабістай уніі з Вялікім Княствам Літоўскім: Аляксандр Ягелончык, вялікі князь літоўскі з 1492 г., у 1501 г. стаў адначасова польскім каралём. Магутная Польшча ў той час займала не апошняе месца ў еўрапейскай палітыцы, але яе валадар не забыўся пра інтарэсы ВКЛ. Між тым на іншым полюсе Еўропы ўзмацнілася Расійская дзяржава. Некаторыя хрысціянскія палітыкі і папа рымскі бачылі ў «Масковіі» магчымага саюзніка ў вайне супраць Асманскай дзяржавы.

Рэспубліканская форма праўлення замацавалася ў некаторых гарадах Італіі. Так, рэспублікай у Венецыі і Генуі кіравала невялікая суполка купцоў-алігархаў. Іерархія ўлады, напрыклад, у Венецыі выглядала наступным чынам: на чале стаяў выбарны дож, паўнамоцтвы якога абмяжоўваў Вялікі савет з ліку прадстаўнікоў купецкай арыстакратыі. Апроч яго існаваў і Малы савет. Абодва саветы кантраляваў створаны ў Познім сярэднявеччы Савет дзесяці — своеасаблівая тайная паліцыя. Гэты савет устанавіў патаемны нагляд за кожным венецыянцам, развіў сістэму даносаў, якія ўкідваліся ў разяўленыя пашчы каменных ільвоў, усталяваных на сценах палаца дожаў. Такая сістэма адлюстравала вострае спаборніцтва ў асяродку кіруючай алігархіі. Сам дож паступова ператварыўся ў дэкаратыўную постаць.

Такім чынам, познесярэдневяковая Еўропа ведала абедзве магчымыя формы праўлення і мела свае



*Пасяджэнне Вялікага савета Венецыянскай рэспублікі. Мастак І. Хайнц. XVII ст.*

адметныя рысы, характэрныя для гэтага перыяду гісторыі.

**2. Асаблівасці развіцця дзяржаў на Усходзе.** Ва Усходняй Азіі панавала дынастыя Мін, што кіравала Кітаем з 1368 да 1644 г. У гэты перыяд кітайская манархія дэманстравала перш за ўсё ўстойлівасць адміністрацыйнай сістэмы. Імператар валодаў абсалютнай уладай, але кіраванне краінай ажыццяўлялася праз складаную бюракратыю, якая ўключала экзаменацыйную сістэму для адбору чыноўнікаў. У гэты перыяд кітайская эканоміка квітнела дзякуючы развіццю сельскай гаспадаркі і ўнутранага гандлю. У Індыі тым часам панаваў Дэлійскі султанат (1206–1526 гг.), які заставаўся важным цэнтрам мусульманскай культуры і палітычнай улады.

У гэты ж час на Амерыканскім кантыненце існавалі высокаразвітыя цывілізацыі ма́я, ацтэкаў і інкаў. Гэтыя грамадствы вылучаліся складанай




*Картасхема «Цывілізацыі мáя, інкаў і ацтэкаў»*

сацыяльнай структурай, велізарнымі архітэктурнымі дасягненнямі і развітым гандлем. Аднак гэты свет заставаўся ізаляваны ад Еўропы да адкрыцця Новага Свету ў 1492 г.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Даведайцеся, якія з трох лацінаамерыканскіх сярэдневяковых цывілізацый сярод сваіх дасягненняў маглі пахваліцца:*
   а) выкарыстаннем кола;
   б) вынаходствам пісьмовасці;
   в) суднаходствам;
   г) будаўніцтвам пірамід;
   д) існаваннем цэнтралізаванай дзяржавы;
   е) валоданнем тэхналогіяй металургіі.
2. *Знайдзіце інфармацыю пра іншыя дасягненні ацтэкаў, інкаў і мáя, сістэматызуючы ўсе дасягненні цывілізацый у тры адпаведныя «воблакі слоў».*

**3. Палітычная карта Еўропы і свету напрыканцы Сярэднявечча.** У канцы Сярэднявечча палітычная карта Еўропы і свету зазнала істотныя змены. Гэты перыяд характарызуецца завяршэннем эпохі феадальнай раздробленасці, пачаткам фарміравання цэнтралізаваных дзяржаў у Еўропе і ростам уплыву вялікіх цывілізацый па-за іх межамі. Палітычная прастора была складаная і разнастайная, з мноствам дзяржаў, межы якіх часта мяняліся ў выніку войнаў, дынастычных шлюбаў і тэрытарыяльных спрэчак. Лідарамі ў палітычным спаборніцтве ў Еўропе напрыканцы Сярэднявечча аказаліся каралеўствы Францыя, Англія, Іспанія, Маскоўскае вялікае княства.

У 1453 г. Асманская імперыя захапіла Канстанцінопаль, што закончыла існаванне Візантыйскай імперыі. Гэтая падзея паўстала вялікай вяхой у гісторыі, адзначыла пераход улады ў рэгіёне да асманаў, якія працягнулі экспансію на Балканах і ва Усходняй Еўропе і ўзялі пад свой кантроль ключавыя гандлёвыя шляхі паміж Еўропай і Азіяй. Напрыканцы Сярэднявечча Асманская імперыя ператварылася ў адну з наймагутнейшых дзяржаў.

У векапомным 1492 г. завяршылася Рэканкіста — барацьба хрысціянскіх каралеўстваў супраць мусульманскіх дзяржаў. Незадоўга перад тым у выніку надзвычай удалага шлюбу Фердынанда Арагонскага з Ізабэлай Кастыльскай пад уладай каталіцкіх каралёў была ўтворана новая дзяржава — Іспанія, гатовая да экспансіі за межы Еўропы. Пачалася эпоха росквіту іспанскай імперыі. Тардэсільяская дамова 1494 г. зацвердзіла падзел усяго свету па-за Еўропай паміж Іспаніяй і Партугаліяй.



*Фердынанд Арагонскі і Ізабэла Кастыльская. Барэльеф. Іспанія. 1632 г.*

Такім чынам, напрыканцы Сярэднявечча палітычная карта Еўропы і свету была стракатай мазаікай. У апошнія гады XV ст. Еўропа яшчэ не была палітычным і эканамічным цэнтрам свету: яна зусім нязначна магла паўплываць на працэсы, што

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Тардэсільяская дамова паміж каралямі Іспаніі і Партугаліі аб падзеле свету (1494 г.)**

Высокія дагаворныя бакі ўмовіліся і пагадзіліся, каб пазбегнуць сумневаў і спрэчак наконт астравоў і зямель, ужо адкрытых або тых, якія будуць адкрыты ў моры-акіяне, каб была праведзена прамая лінія ад полюса да полюса, то-бок ад полюса арктычнага да полюса антарктычнага з поўначы на поўдзень, за 370 ліг на захад ад астравоў Зялёнага Мыса, на адлегласці, вызначанай у градусах або іншымі спосабамі, якія будуць прызнаны найбольш прымальнымі і зручнымі, і вымеранай без лішку або нястачы, і каб усё, што ўжо адкрыта або будзе адкрыта каралём Партугаліі або яго караблямі, да прыкладу астравы або мацерыкі на ўсход ад гэтай лініі і ўнутры яе на поўначы і на поўдні, належала названаму сеньёру — каралю Партугаліі і яго пераемнікам на векі вечныя, і каб усе астравы і мацерыкі, як адкрытыя, так і тыя, што будуць адкрыты каралём і каралевай Кастыліі і Арагона або іх караблямі на захад ад названай лініі, на поўначы і на поўдні, належалі азначаным сеньёрам — каралю і каралеве і іх пераемнікам на векі вечныя.

Высокія дагаворныя бакі абяцаюць праз сваіх прадстаўнікоў, што цяпер і надалей не будуць яны адпраўляць ніякіх караблёў: названыя кароль і каралева Кастыліі і Арагона — у моры, што знаходзяцца на ўсход ад названай лініі і належаць каралю Партугаліі, а кароль Партугаліі — у моры па іншы бок лініі на захад ад яе, якія лічацца прыналежнымі каралю і каралеве Кастыліі.

Таксама ні адзін з бакоў не будзе чыніць адкрыццяў і заваёў і не будзе весці гандаль за раздзяляльнай лініяй, пазначанай згодна з вышэйсказаным. І калі выпадкам караблі караля Партугаліі апынуцца ў порце, які належыць каралю Кастыліі, дык тыя караблі маюць быць неадкладна перададзены каралю Партугаліі, і гэтаксама няхай будзе ўчынена апошнім у дачыненні да караля Кастыліі.

1. *Вызначце, як, згодна з тэкстам дамовы, былі падзелены землі шасці кантынентаў паміж іспанскай і партугальскай каронамі.*
2. *Растлумачце, чаму менавіта партугальская і іспанская дзяржавы «дзялілі» паміж сабою агромністыя тэрытарыяльныя прасторы па ўсім свеце.*

адбываліся на Усходзе, у Афрыцы і тым больш на Амерыканскім кантыненце. У гэты час людзі асобных частак свету яшчэ не ведалі адны пра другіх. Адкрытыя для сябе еўрапейцамі Амерыка, Аўстралія і Акіянія былі сапраўдным *Новым Светам*, невядомым раней і супрацьпастаўленым даўно асвоенаму Старому Свету. Экспедыцыі Х. Калумба

выступяць імпульсам для пашырэння ўплыву Заходняй Еўропы не толькі на Амерыку, але і на ўвесь свет. Ствараліся ўмовы для пачатку эпохі Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, фарміравання першых каланіяльных імперый і зараджэння сучаснай сістэмы міжнародных адносін.

Вучоныя разглядаюць дзве ключавыя даты заканчэння эпохі Сярэднявечча: 1453 г. і 1492 г.

1. *Растлумачце, якія гістарычныя падзеі звязаны з кожнай з гэтых дат і чаму яны лічацца значнымі.*
2. *Прывядзіце аргументы на карысць кожнай пазіцыі. Абмяркуйце, ці магчыма дасягнуць кампрамісу, прымальнага для прыхільнікаў абодвух пунктаў гледжання.*